ТРЭЦІ ЭТАП XXXIII РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ
ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА»
І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

# ДАВЕДКІ

**10 клас**

**Варыянт І**

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | **4** | **6** | **6** | **4** | **5** | **5** | **5** | **5** | **6** | **4** | **50** |

## Заданне 1

| | | | |
|---|---|---|---|
| неад'емны | | абівацъ | |
| асвістаць | | збіцца | + |
| ссекчы | + | снедаць | |
| усцешаны | + | з'ява | + |

## Заданне 2

| | |
|---|---|
| падстаўляць плячо (*каму*)<br>падпіраць плячом (*каго*)<br>браць на буксір (*каго*) | ***цягнуць за вушы*** |
| хоць бы хны<br><і> не лыс<br><і> у вус <сабе> не дзьмуць | ***і вухам не весці (не павесці)*** |
| аж нос гнецца<br>за абедзве шчакі<br>на поўны рот | ***аж за вушамі трашчыць*** |

## Заданне 3

ПРЫКЛАДНЫ ВАРЫЯНТ ПЕРАКЛАДУ:

Пачуўшы гэта, я замёр на сваім месцы. Утаропіўшы вочы ва ўзлесак, я бессэнсоўна ўсміхаўся; пот каціўся з мяне градам, і хоць кроплі яго, збягаючы па падбародку, казыталі мяне, я не выціраў іх. Мне здавалася, што не можа быць хвіліны больш рашучай *(вырашальнай, рашаючай)*, чым гэтая *(гэта)*. Становішча гэтай напружанасці было занадта ненатуральнае, каб працягвацца доўга. Ганчакі то заліваліся каля самага ўзлеску, то паступова аддаляліся ад мяне; зайца не было. Я стаў азірацца *(глядзець)* па баках *(Паводле Л. М. Талстога)*.

### Заданне 4

| Назва расліны | Утваральная аснова | Спосаб словаўтварэння |
|---|---|---|
| **Узор:** *Канюшына лугавая* | *луг* (□) *+ав (ы)* | суфіксальны |
| *Бяроза* ***павіслая*** | павісну(ць) + *л(ы)* | *суфіксальны* |
| *Ліпа* ***сэрцалістая*** | *сэрц*(а) + *а*+ *ліст*(□) + ø (ы) | *складана-нульсуфіксальны* |
| *Кадзіла* ***сармацкае*** | сармат (□) +*ск(і)* | *суфіксальны* |
| *Крапіва* ***двухдомная*** | дв(а) +*ух* + *дом*(□) + *н (ы)* | *складана-суфіксальны* |

### Заданне 5

1. У 1885 г. беларус В. Цэраскі адкрыў існаванне так званых серабрыстых аблокаў і ўстанавіў, што яны знаходзяцца над планетай ***Зямля*** на вялікай адлегласці. 2. А. Кіркор сцвярджаў, што першапачатковая назва горада ***Вільні*** – Крывы горад – паходзіць ад імя жраца Крэве, які нібыта жыў у гэтым горадзе. 3. Выпраўляючыся да возера ***Свіцязь***, варта пакласці ў пляжную торбу томік Адама Міцкевіча, многія вершы якога звязаны з гэтым краем. 4. Некаторыя вучоныя лічаць, што ў аснове назвы горада ***Мар'іна Горка*** ляжыць пакланенне багіні Мары – апякунцы жанчын і дзяцей. 5. Вядомы гісторык М. Ермаловіч адзначае, што з Пасожжа дулебы прыйшлі ў басейн ракі ***Акі***.

**Каментар**

Дапасуюцца назвы гарадоў (*горада Мінска*), назвы рэк (*на рацэ Дняпры, на рацэ Беразіне*, за выключэннем малавядомых). Разам з тым састаўныя назвы населеных пунктаў і рэк не дапасуюцца: *у горадзе Мар'іна Горка, каля горада Старыя Дарогі, на рацэ Паўночны Данец* і інш. Не дапасуюцца таксама назвы азёр, гор, астравоў, паўастравоў, астранамічныя назвы, назвы станцый, портаў, замежныя адміністрацыйна-тэрытарыяльныя назвы: *арбіта планеты Марс, у праліве Басфор, у порце Адэса, у штаце Тэхас* і інш.

### Заданне 6

| | |
|---|---|
| 1. Дзеясловы, якія абазначаюць дзеянне, што пераходзіць на які-небудзь прадмет ці асобу, – | ***пераходныя дзеясловы*** |
| 2. Форма прыметніка, якая абазначае самую высокую або самую нізкую ступень якасці, – | ***найвышэйшая ступень параўнання прыметніка*** |
| 3. Займеннікі, што ўказваюць на блізкія ці аддаленыя прадметы, іх якасці і колькасць, – | ***указальныя займеннікі*** |
| 4. Самастойная нязменная часціна мовы, якая абазначае прымету дзеяння або прымету іншай прыметы ці прадмета, – | ***прыслоўе*** |
| 5. Часціцы, што ўдакладняюць і падкрэсліваюць значэнне слоў, перад якімі стаяць, – | ***удакладняльныя часціцы*** |

## Заданне 7

СМАЧНА ЕСЦІ!



1) *рыба* (засушаная)
2) *грыбы* (засушаныя ці свежыя)
3) *цыбуля*
4) *перац*
5) *лаўровы* (*бабковы*) *ліст*

І вось вячэра зачалася!
Спыніцца мушу я на квасе:
Ён колер меў чырванаваты;
Тут быў таран, мянёк пузаты,
Шчупак, лінок, акунь, карась,
Кялбок і ялец, плотка, язь,
Яшчэ засушаныя з лета.
Але не ўсё яшчэ і гэта:
Аздоблен квас быў і грыбамі,
Выключна ўсё баравічкамі;
Цыбуля, перчык, ліст бабковы –
Ну, не ўясісь, каб я здаровы!
Пільнуй, — цішком скажу між намі, –
Каб і язык не ўцёк часамі

(Якуб Колас. *Новая зямля*)

## Заданне 8

**Па гарызанталі:** 2 – апавяданне; 4 – санет; 7 – трыялет; 9 – аповесць.
**Па вертыкалі:** 1 – драма; 3 – камедыя; 5 – ідэя; 6 – раман; 7 – тэма; 8 – трагедыя.

**Каментар:** за кожны правільны адказ налічваецца 0,5 бала.

## Заданне 9









| | | |
|---|---|---|
| Да гэтай кнігі адносяцца наступныя гісторыка-літаратурныя рэаліі: | Да гэтай кнігі адносяцца наступныя гісторыка-літаратурныя рэаліі: | Да гэтай кнігі адносяцца наступныя гісторыка-літаратурныя рэаліі: |
| **1, 11, 15, 16** | **2, 3, 8, 12** | **5, 7, 10, 14** |

**Каментар**: за кожны правільны адказ налічваецца 0,5 бала.

### Заданне 10

| | |
|---|---|
| 1. Памер верша | **5-стопны ямб** |
| 2. Тып рыфмоўкі | **Кальцавая (апаяс(а)ная)** |
| 3. Сінтаксічны сродак мастацкай выразнасці ў першай страфе | **Анафара і (або) полісіндэтон (шматзлучнікавасць)** |
| 4. Радок, у якім заключаецца галоўная ідэя твора | **Дык не чакай, а дзейнічай, жыві!** |

**Каментар**: за кожны правільны адказ налічваецца 1 бал.